# Метадычныя аспекты работы па вучэбным дапаможніку «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання

Да 2022/2023 навучальнага года для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання выдадзены вучэбны дапаможнік па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».

Аўтарская канцэпцыя распрацоўкі вучэбнага дапаможніка па беларускай мове грунтавалася на неабходнасці эфектыўнай рэалізацыі ўстановак *кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў*. У аснове адбору моўнага матэрыялу і распрацоўкі зместу дапаможніка ляжаць прыватнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай мове: апоры на нормы літаратурнага вымаўлення, уліку білінгвальнага руска-беларускага асяроддзя, узаемазвязанага развіцця відаў маўленчай дзейнасці, развіцця індывідуальнай адукацыйнай траекторыі вучня, камунікатыўнай накіраванасці навучання мове.



***Антановіч Наталля Міхайлаўна,***
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*



***Антонава Надзея Уладзіславаўна,***
*начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Пры распрацоўцы вучэбнага дапаможніка мелася на мэце забяспечыць эфектыўнае авалоданне вучнямі II класа зместам адукацыі ў адзінстве матывацыйна-мэтавага, індывідуальна-развіццёвага і дзейнаснага напрамкаў навучання мове. Для дасягнення пастаўленай мэты былі вызначаны наступныя **задачы**:

- забяспечыць устойлівую матывацыю да вывучэння беларускай мовы праз цікавасць і жыццёвую абгрунтаванасць зместу навучання;
- прапанаваць эфектыўныя спосабы вырашэння вучэбных задач на аснове асэнсавання моўных з'яў і свядомага фарміравання прадметных уменняў, навыкаў і спосабаў дзейнасці;
- прадставіць у поўным аб'ёме матэрыял, неабходны для дасягнення вынікаў вучэбнай дзейнасці, прадугледжаных вучэбнай праграмай;
- закласці магчымасці для рэалізацыі індывідуальнага развіцця вучня;
- рэалізаваць праз форму і змест заданняў актыўную, асэнсаваную, матываваную вучэбную дзейнасць на занятках па беларускай мове.

Такім чынам, у аснове падыходу да распрацоўкі вучэбнага дапаможніка знаходзілася пытанне яго метадычнай эфектыўнасці, універсальнасці прымянення ў зададзеных умовах навучання і адукацыйнай мэтазгоднасці, якая забяспечваецца формай і зместам вучэбнага матэрыялу.

Распрацоўка вучэбнага дапаможніка па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для II класа

ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання праводзілася ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (2017). Вучэбны дапаможнік павінен забяспечыць рэалізацыю ўсіх вызначаных вучэбнай праграмай напрамкаў навучання беларускай мове: моўнага, маўленчага, камунікатыўнага, лінгвакультуралагічнага, сацыякультурнага, забяспечыць пераемнасць паміж навучаннем грамаце і сістэматычным вывучэннем беларускай мовы.




Выкладанне беларускай мовы ў ІІ класе працягвае сістэму працы, распачатую на ўроках навучання грамаце. Узровень вучэбных задач, якія неабходна вырашыць на ўроках беларускай мовы ў ІІ класе, істотна ўзрастае, таму што вучні пачынаюць знаёміцца з мовай як сістэмай. Неабходнасць забяспечыць бесканфліктны і прыродаадпаведны пераход ад фарміравання элементарных навыкаў чытання і пісьма да асэнсавання навуковаарганізаванага прадметнага зместу з'явілася падставай для ўвядзення пры распрацоўцы вучэбнага дапаможніка па беларускай мове наступных элементаў і характарыстык зместу:

– прапануецца гука-літарны аналіз слоў, прызначаных для назірання за вывучаемай моўнай з'явай, на падставе гукавых схем, якія прымяняліся ў перыяд навучання грамаце;

– паступова павялічваецца аб'ём і складанасць пісьмовых заданняў ад запісу асобных слоў і сказаў да тэкстаў;

– уведзены персанаж (***хлопчык Чамучык*** (мал. 1)) па аналогіі з персанажамі буквара;

– прадугледжаны сказы, запісаныя пісьмовымі літарамі, даецца ўзор пісьмовых літар у алфавіце на форзацы дапаможніка для ўзнаўлення, замацавання і развіцця графічных навыкаў вучняў;

– пададзены абагуленыя характарыстыкі гукаў беларускай мовы ў алфавіце на форзацы з дапамогай сістэмы знакаў, прынятай у навучанні грамаце, і ў выглядзе сістэмы гукавых супастаўленняў і класіфікацый на стужцы літар;

– прадугледжаны пытанні і заданні для асэнсавання тэкстаў практыкаванняў, як у паслябукварны перыяд навучання грамаце;

– уключаны пытанні і заданні, якія прадугледжваюць апору на веды, што вучні атрымалі на ўроках навучання грамаце (напрыклад: *Што вы ведаеце пра Францыска Скарыну? Раскажыце, што вы ведаеце пра старажытныя кнігі*).

Асноўная праца па паступовым пераходзе ад навучання грамаце да вывучэння сістэмы мовы ў ІІ класе забяспечваецца дзейнасцю настаўніка, які ўлічвае ўзровень адукацыйных дасягненняў вучняў класа ў папярэдні год навучання: узровень развіцця вуснага маўлення і графічных навыкаў, валоданне навыкам чытання.

Структура вучэбнага дапаможніка адпавядае структуры зместу навучання, пададзенага ў вучэбнай праграме па беларускай мове. Матэрыял сістэматызаваны па раздзелах «Родная мова», «Гукі і літары», «Тэкст», «Сказ», «Словы», «Паўтарэнне». Раздзелы падзяляюцца на тэмы. Кожная тэма можа ўключаць некалькі заняткаў. Матэрыял кожных заняткаў структураваны ў адпаведнасці з тыпам урока.

У ІІ класе абвастраецца праблема матывацыі да вывучэння мовы ў сувязі з тым, што элементарныя навыкі ўжо сфарміраваныя, а асэнсаванне моўнай сістэмы патрабуе ад вучняў значных намаганняў. У рэальных сацыяльна-педагагічных умовах на першы план выступае наяўнасць дадатковых стымулаў для матываванага вывучэння беларускай мовы і асэнсавання жыццёвай запатрабаванасці ў авалоданні ёю, непарыўнасць сувязі ўрокаў беларускай мовы з жыццём. Рэалізацыя гэтых матывацыйных стымулаў магчыма праз вучэбны матэрыял дапаможніка.

Урок вывучэння новай тэмы пачынаецца з абмеркавання ***праблемнай сітуацыі*** (аналізу шляхоў да вырашэння вучэбна-практычнай або жыццёвай задачы), з якой сутыкаецца вобразны персанаж Чамучык (мал. 2).



Малюнак 1



— Бабулечка, давай пагуляем у перакладчыка, — прапанаваў Чамучык.

— Давай! Пачынай! — пагадзілася бабуля.

Чамучык паглядзеў у акно і запісаў словы па-руску: снежинка, темнеть, зелёный, сестра. Бабуля пераклала іх на беларускую мову: сняжынка, цямнець, зялёны, сястра.

— Цікава, бабулечка! У беларускай мове замест ***е*** трэба пісаць ***я***?

Калі ў словах замест ***е, ё*** пішацца ***я***?

Малюнак 2

Праблемную сітуацыю на ўроку можа прачытаць настаўнік або вучань, у якога навык чытання сфарміраваны на належным узроўні. Кожная праблемная сітуацыя завяршаецца праблемным пытаннем, якое выдзелена шрыфтам блакітнага колеру.

Першае практыкаванне пасля праблемнай сітуацыі набліжае вучняў да асэнсавання моўнай з'явы ці заканамернасці, спрыяе свядомаму ўспрыманню правіла, якое ідзе пасля гэтага практыкавання. Пасля аналізу спецыяльна падабранага моўнага матэрыялу вучні робяць вывад. Правіла яны таксама «адкрываюць» разам з Чамучыкам, які імкнецца ***знайсці «ключ» да ведаў*** (**рубрыка «Трэба ведаць»**) (мал. 3). Навуковая інфармацыя падаецца ў даступнай для другакласнікаў форме, што дапаможа зрабіць працэс авалодання мовай больш эфектыўным.

У беларускай мове ў першым складзе перад націскам замест літар *е*, *ё* пішацца *я*: *лес — лясны́, лёд — лядо́к*. Ва ўсіх іншых ненаціскных складах пішацца *е*: *ле-са-ві́к, ле-дзя-ны́, во́-зе-ра*.

Малюнак 3

У выпадку, калі патрабуецца пэўнае ўдакладненне ці маецца выключэнне з правіла, Чамучык ***знаходзіць звесткі*** ў **рубрыцы «Важная інфармацыя»** (мал. 4). Для матываванага яе ўвядзення ў вучэбным дапаможніку прапануецца практыкаванне, у працэсе выканання якога вучні сутыкаюцца з праблемай, калі ведаў недастаткова ці правіла не выконваецца. Гэта праблема вырашаецца з дапамогай інфармацыі рубрыкі.

У некаторых словах, якія прыйшлі ў нашу мову з іншых моў, літара *е* пішацца ў першым складзе перад націскам: *пена́л, педа́ль, перо́н, апельсі́н, кефі́р, сезо́н, секу́нда, метро́*. Іх напісанне трэба правяраць па арфаграфічным слоўніку.

Малюнак 4

Авалоданне спосабамі дзейнасці, фарміраванне ўменняў і навыкаў адбываецца паслядоўна ў працэсе выканання разнастайных па змесце і ступені складанасці практыкаванняў. У вучэбным дапаможніку прадстаўлены пошукавыя, часткова-пошукавыя і творчыя заданні, якія актывізуюць разумовую дзейнасць вучняў, падахвочваюць да разважанняў, новых спосабаў дзейнасці. Так, вучням прапануецца паўдзельнічаць у стварэнні рэкламнага буклета, скласці або ўзнавіць кулінарны рэцэпт і інш. Такія заданні будуць садзейнічаць пашырэнню і ўдакладненню актыўнага слоўнікавага запасу вучняў, развіццю іх маўлення, творчых здольнасцей, пазітыўных адносін, цікавасці да вывучэння роднай мовы.

Упершыню ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове прапануюцца **рознаўзроўневыя заданні на выбар** (**заданні «пілотаў» і «касманаўтаў»**) (мал. 5). Такія заданні могуць размяркоўвацца паміж вучнямі настаўнікам або выконвацца на выбар вучняў. Гэта дазволіць, з аднаго боку, рэалізаваць настаўніку індывідуальны і дыферэнцыраваны падыходы на ўроку, а з другога — зрабіць кожнаму вучню самастойны выбар з улікам сваіх магчымасцей.

**115.** Прачытайце слупкі слоў. Замест малюнкаў называйце адпаведныя словы.

| | | |
|---|---|---|
| снег | вецер | бег |
| снягі | вятры | бягуць |
| сн..гавы | в..ц..рок | праб..жка |





Якая літара пішацца пад націскам у словах першага радка? Вызначце ў словах другога радка націск. Назавіце першы пераднаціскны склад. Растлумачце правапіс *я*.

Запішыце словы трэцяга радка.

Запішыце словы чацвёртага радка.

Пастаўце ў словах націск. Падзяліце словы рыскамі на склады. Падкрэсліце першы пераднаціскны склад.

Малюнак 5

Звернем увагу на тое, што аб'ём выканання заданняў таксама можа вар'іравацца ад выканання аднаго з заданняў ці яго часткі да выканання ўсіх заданняў практыкавання.

Заняткі па замацаванні маюць больш простую структуру ў параўнанні з заняткамі па вывучэнні новай тэмы. Яны ўключаюць практыкаванні, якія размеркаваны па ступені ўзрастання складанасці.

У сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя ў вучняў магчымы памылкі інтэрферэнцыйнага характару. З улікам гэтага ў рубрыцы «Важная інфармацыя», а таксама ў некаторых практыкаваннях прадугледжана **супастаўленне пэўных фактаў у беларускай і рускай мовах** з мэтай папярэджання памылак як у вусным, так і пісьмовым маўленні (мал. 6).

| У беларускай мове | У рускай мове |
|---|---|
| *жы, шы,*<br>*жэ, шэ, цэ* | *жи, ши,*<br>*же, ше, це* |
| *жывот, шына,*<br>*жэтон, цэмент* | *живот, шина,*<br>*жетон, цемент* |

Малюнак 6

Традыцыйна кожныя заняткі завяршаюцца практыкаваннем для **дамашняй работы**, распрацаваным у адпаведнасці з санітарнымі нормамі. Такія заданні пазначаны ***ўмоўным знакам «домік»*** (мал. 7).



*Малюнак 7*

Каб настаўніку і вучням лягчэй было зарыентавацца ў вучэбным дапаможніку, **пачатак новых заняткаў *пазначаны знакам*** (мал. 8).



*Малюнак 8*

Варта заўважыць, што асноўны змест моўнай адукацыі ў II класе звязаны з асэнсаваннем фанетыка-арфаэпічных і графіка-арфаграфічных аспектаў беларускай мовы, якія з'яўляюцца складанымі для навучання ў сувязі з тым, што патрабуюць дастаткова развітога фанематычнага слыху, вымаўленчых навыкаў, устойлівага графічнага навыку. Тым больш, што раздзел «Гукі і літары» вывучаецца толькі ў II класе.

Сензітыўны перыяд для авалодання фанетыкай і правапісам на аснове фанетычнага прынцыпу захоўваецца, па сведчанні М. Р. Львова, да сямігадовага ўзросту. У гэты час можна арганізаваць засваенне арфаэпічных і правапісных нормаў праз фаналагічныя абагульненні, фарміраванне якіх прадугледжвае матэрыял вучэбнага дапаможніка. Сфарміраваныя на такой аснове арфаграфічныя ўменні і навыкі характарызуюцца большай трываласцю, чым выпрацаваныя шляхам завучвання і фармальнага прымянення правілаў.

У II класе вучні пераважна засвойваюць напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе беларускай арфаграфіі, таму фарміраванне адпаведных арфаграфічных уменняў і навыкаў ажыццяўляецца ва ўзаемасувязі з развіццём арфаэпічных уменняў і навыкаў, маўленчага слыху вучняў.

Для таго каб прывесці ў дзеянне арфаграфічнае правіла, трэба не толькі ведаць яго, але і засвоіць спосаб прымянення, умець карыстацца ім у канкрэтных сітуацыях. У сувязі з гэтым у вучэбным дапаможніку прапануюцца **алгарытмы правапісу (апорныя схемы)**, якія ўключаны ў змест практыкаванняў і дазволяць свядома прымяняць правілы (мал. 9).

Да схемы вучні могуць звяртацца і пры выкананні іншых практыкаванняў з мэтай вызначэння правільнага напісання слоў. Асабліва актуальным з'яўляецца прымяненне алгарытмаў на першапачатковым этапе фарміравання арфаграфічнага навыку, што дазволіць вучням усвядоміць і запомніць паслядоўнасць дзеянняў.

Правілы правапісу, заснаваныя на фанетычным прынцыпе, з якімі вучні знаёмяцца ў першай частцы вучэбнага дапаможніка, схематычна даюцца на форзацы. Гэта правілы правапісу ***о, э — а; е, ё — я***; правапісу ***ў*** (***у*** нескладовага). Час і месца працы з імі на ўроку кожны настаўнік вызначае самастойна. Да прапанаваных схем вучні могуць звяртацца і дома.

Арфаграфічныя дзеянні аўтаматызуюцца паступова, што залежыць ад складанасці арфаграмы. Забяспечыць паспяховае авалоданне арфаграфіяй могуць арфаграфічныя практыкаванні, пададзеныя ў сістэме. Сістэма практыкаванняў, прадстаўленая ў вучэбным дапаможніку, прадугледжвае рэгулярнасць, бесперапыннасць трэніровачнай работы, паступовае павелічэнне самастойнасці вучняў у працэсе выканання практыкаванняў, ускладненне характару заданняў, пашырэнне іх агульнамаўленчай і стылістычнай накіраванасці, садзейнічае маўленчаму і інтэлектуальнаму развіццю вучняў.

Распрацоўка арфаграфічных практыкаванняў ажыццяўлялася з улікам пяці паслядоўных узаемаабумоўленых этапаў фарміравання арфаграфічнага навыку:

1) знаёмства з арфаграмай і яе апазнавальнымі прыметамі;

2) разуменне сутнасці арфаграфічнага дзеяння;

3) запамінанне спосабу арфаграфічнага дзеяння;

4) фарміраванне арфаграфічнага ўмення;

5) аўтаматызацыя арфаграфічнага ўмення.

У вучэбным дапаможніку прадстаўлены *разнастайныя арфаграфічныя практыкаванні*, разлічаныя як на зрокавае, так і слыхавое ўспрыманне: спісванне з дадатковымі заданнямі, навучальныя дыктанты (запіс пад дыктоўку настаўніка асобных слоў, сказаў, тэкстаў), пісьмо па памяці.

На форзацы ў першай частцы вучэбнага дапаможніка прадстаўлены алгарытмы спісвання, пісьма пад дыктоўку і па памяці, што дапаможа настаўніку правільна арганізаваць працу на ўроку, скіраваць вучняў на свядомае выкананне адпаведных практыкаванняў.

Асаблівая ўвага ў вучэбным дапаможніку надаецца заданням, накіраваным на **развіццё арфаграфічнай пільнасці** — здольнасці вылучаць арфаграмы ў словах, вызначаць іх тыпы. Гэта заданні на знаходжанне, падкрэсліванне і тлумачэнне правапісу слоў на вядомыя правілы; групоўку слоў у залежнасці ад тыпу арфаграмы; падбор вучнямі




*Малюнак 9*

слоў на тую ж арфаграму, што і ў прапанаваным слове; гука-літарны аналіз слоў і інш.

Адной з умоў дасягнення вучнямі арфаграфічнай пісьменнасці з'яўляецца засваенне імі правапісу слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў), работа з якімі патрабуе асаблівай увагі. Пералік слоўнікавых слоў падаецца ў канцы першай і другой частак вучэбнага дапаможніка ў той жа паслядоўнасці, у якой яны вывучаюцца на занятках. У другой частцы дапаможніка на форзацах будуць размешчаны зрокавыя апоры ў выглядзе слоўнікавых слоў з малюнкамі, што дазволіць вучням устанаўліваць пэўныя асацыяцыі і запамінаць напісанне слоў.

**Слоўнікавыя словы** прадстаўлены асобна на старонках дапаможніка (мал. 10).




*Малюнак 10*

Сістэматычнае знаёмства са слоўнікавымі словамі прадугледжана ў працэсе работы над практыкаваннямі, змест і форма якіх забяспечваюць актыўную дзейнасць слыхавой, зрокавай і рухальнай памяці.

Важна, каб цяжкае ў арфаграфічных адносінах слова было шматразова запісана пры першым яго прад'яўленні, але не шляхам механічнага дубліравання запісу. З гэтай мэтай у вучэбным дапаможніку, як правіла, падаецца некалькі практыкаванняў, у якіх сустракаецца новае слоўнікавае слова. Праца са слоўнікавымі словамі звязваецца з матэрыялам, засваенне якога прадугледжана на ўроку.

Паколькі пры аднаразовым або двухразовым напісанні слова неабходны арфаграфічны навык не выпрацоўваецца, засвоеныя слоўнікавыя словы ўключаны ў разнастайныя па змесце практыкаванні на старонках вучэбнага дапаможніка.

Маўленчы і камунікатыўны напрамкі ў навучанні беларускай мове рэалізуюцца ў змесце вучэбнага дапаможніка сістэмна і паслядоўна. Варта адзначыць, што традыцыйная для вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове рубрыка «Развіццё маўлення» не прапануецца. У адрозненне ад набору фармалізаваных заданняў кшталту «складзі сказ са словам...», «прыдумай апавяданне на тэму...» на падставе матэрыялу практыкаванняў прапануюцца такія пытанні і заданні, якія стымулююць нефармальныя адказы вучняў на падставе іх жыццёвага вопыту ці інтарэсаў. Матывацыя да маўлення закладваецца ў самім вучэбным матэрыяле, які непарыўна звязаны як з моўным, так і маўленча-камунікатыўным зместам адукацыі. Такая знітаванасць развіцця маўлення вучняў з фарміраваннем у іх моўных уменняў і навыкаў адпавядае ўстаноўкам маўленча-камунікатыўнага падыходу і забяспечвае фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Матываваныя тэкстам ці моўнай сітуацыяй заданні па развіцці маўлення прысутнічаюць непасрэдна ў практыкаваннях у змесце амаль кожных заняткаў дапаможніка. Адказы вучняў могуць фармулявацца праз выкарыстанне фрагментаў тэксту як маўленчага ўзору, слоўных апор, з прыцягненнем дадатковых крыніц інфармацыі ці стымуляваць да іх выкарыстання. Як правіла, **заданні на развіццё маўлення** ўтрымліваюць пэўны **займальны кампанент ці кагнітыўна ўскладнены** (мал. 11).

**105.** Уявіце, што вы ўдзельнічаеце ў распрацоўцы рэкламнага буклета. Дапоўніце яго патрэбнымі словамі.

Словы для даведкі: *экскурсіі, сябры, падарожнічаць.*




Спішыце апошні сказ. Пастаўце націск у слоўнікавым слове. У першым пераднаціскным складзе падкрэсліце літару галоснага гука.

Куды запрашае падарожнікаў буклет? Раскажыце, як пра гэта можна напісаць у буклеце.

*Малюнак 11*

У адпаведнасці з сучаснымі навуковымі распрацоўкамі ў сістэме развіцця маўлення вучняў павінна быць рэалізавана ўзаемасувязь паміж навучаннем розным відам маўленчай дзейнасці. Сістэма ўзаемазвязанага навучання відам маўленчай дзейнасці ў II класе, якая рэалізуецца ў вучэбным дапаможніку, накіравана на авалоданне чытаннем як відам маўленчай дзейнасці, звязаным з ім гаварэннем і, паступова, пісьмовым маўленнем (навучанне пераказу). У гэтай сістэме дамінуючым відам маўленчай дзейнасці выступае чытанне як дзейнасць, якая ў сваю чаргу з'яўляецца сродкам навучання маўленчай дзейнасці.

У аснове сістэмы развіцця маўлення ляжыць праца з тэкстам практыкавання, накіраваная на яго асэнсаванае ўспрыманне і глыбокае разуменне. Звыклая фармулёўка задання «прачытайце тэкст» прадугледжвае працу па падрыхтоўцы да ўспрымання, у тым ліку прагназаванне зместу тэксту па пачатку, апорных словах і (ці) ілюстрацыі, кантроль асэнсаванасці чытання ў працэсе ўспрымання і праверку разумення тэксту. Асабліва важна надаваць такой працы ўвагу ў II класе, калі навык чытання яшчэ не такі трывалы, каб можна было згортваць дзейнасць па асэнсаванні тэксту. Асэнсаванне прачытанага тэксту з'яўляецца стымульным фактарам для ажыццяўлення камунікацыі розных узроўняў. Напрыклад: на падставе прачытанага ўрыўка з казкі вучням даецца заданне праінсцэніраваць размову зайчыкаў.

Разам з тым у вучэбным дапаможніку прадугледжана праца па развіцці маўлення на фанетыка-арфаэпічным, лексічным і сінтаксічным узроўнях, адпаведна вывучаемай тэме. Асаблівая ўвага скіравана на выпрацоўку вымаўленчых навыкаў:

падабраны разнастайны дыдактычны матэрыял, уключаны спецыяльныя заданні. Шмат увагі надаецца адпрацоўцы вымаўлення адметных гукаў беларускай мовы [ч], [дз'], [ц'] і інш.

Практыкаванні насычаны заданнямі, накіраванымі на ўдакладненне, узбагачэнне і актывізацыю слоўнікавага запасу вучняў, утрымліваюць матэрыял для мадэлявання выказванняў на аснове апорных слоў і словазлучэнняў. Змест практыкаванняў арыентуе на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў безэквівалентнай лексікай (*апоўдні, бра́ткі, бярозавік, вырай, зацірка* і інш.), устойлівымі выразамі, прыказкамі і прымаўкамі. Значную дапамогу ў фарміраванні актыўнага лексікону ў вучняў будзе аказваць выкарыстанне тлумачальнага слоўніка, змешчанага ў канцы вучэбнага дапаможніка, дзе падаюцца значэнні слоў, пазначаных у тэксце зорачкай. Вучні не толькі даведаюцца пра значэнне невядомага слова, але і авалодаюць уменнем карыстацца тлумачальным слоўнікам.

Прапануецца праца з дэфармаванымі сказамі і тэкстамі. Напрыклад, вучням неабходна размясціць часткі тэксту ў патрэбнай паслядоўнасці. Усё гэта рыхтуе да навучання пераказу, чаму нададзена асаблівая ўвага ў змесце і структуры вучэбнага дапаможніка. Сістэмна падаюцца практыкаванні, у якіх патрабуецца падзяліць тэкст на часткі, сфармуляваць пытанні па змесце ці адказваць на іх, у тым ліку пісьмова. Для паступовай падрыхтоўкі вучняў да пераказу ў практыкаваннях даюцца заданні вусна пераказаць тэкст ці частку тэксту пасля адпаведнай метадычнай работы.

Змест вучэбнага дапаможніка накіраваны на авалоданне *лінгвакультуралагічнай* і *сацыякультурнай кампетэнцыямі*. У тэкстах падаецца інфармацыя пра беларускія сімвалы (зубр, лён, бульба). Падабраны і састаўлены цікавыя тэксты пра беларускія народныя святы (Дажынкі, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны), Нацыянальную бібліятэку Беларусі, першы лялечны тэатр на Беларусі — батлейку, беларускія ручнікі, розныя куткі Беларусі (вёска Ляўкі, возера Нарач), пра рэчы, якімі карысталіся людзі раней (збан, куфар) і інш. Вучні даведаюцца пра паходжанне беларускіх назваў месяцаў — верасень, кастрычнік, лістапад, сакавік. Прадугледжана засваенне правіл маўленчага этыкету, авалоданне сацыяльнымі нормамі маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін; фарміраванне ўважлівага стаўлення да беларускага слова.

Матэрыял вучэбнага дапаможніка скіраваны на *фарміраванне функцыянальнай граматнасці*, вынікам якой з'яўляецца авалоданне вучнямі сістэмай ключавых кампетэнцый, фарміраванне ўніверсальных вучэбных дзеянняў. Фармулёўкі заданняў і структура практыкаванняў накіраваны на авалоданне *пазнавальнымі, рэгулятыўнымі, інфармацыйна-камунікатыўнымі* уменнямі. Метапрадметныя вынікі будуць забяспечваць авалоданне вучнямі ключавымі кампетэнцыямі, што складаюць аснову ўмення вучыцца.

***Антановіч Н. М.****, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.****, начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Урокі 1–9 змешчаны ў электронным дадатку да часопіса.*

### Урок* 10. Абазначэнне літарамі *е, ё, ю, я, і* галосных гукаў і мяккасці зычных гукаў

***Мэты ўрока:*** актуалізаваць веды пра ролю літар ***е, ё, ю, я, і***; фарміраваць уменне правільна абазначаць галосныя гукі літарамі на пісьме, вызначаць літары, якія ўказваюць на мяккасць зычных гукаў; развіваць фанематычны слых; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць уменне фармуляваць пытанні да кожнай часткі тэксту, вусна пераказваць тэкст; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, літары, наборнае палатно, карткі са складамі *бя, нё, зю, пі, гі*; малюнак, на якім адлюстравана краска; карткі з лічбамі 1, 2, 3 для арганізацыі групавой работы.

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.